«НА ЦЯБЕ, НАША МОЛАДЗЬ, НАДЗЕЯ»



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4. Малады ... — палявы вецер: бяжыць і гудзіць *(прык.)* **6.** «Першыя дваццаць гадоў — самая доўгая ... жыцця». Р. Сауці. **8.** Любоў — як ...; не клюе — зматвай вудачкі *(прык.)*; 27 чэрвеня — Сусветны дзень рыбалоўства. **11.** Цэлы дзень касіў сена, а за ноч ... з'ела *(прык.)*. **15.** «На цябе, наша моладзь, ...». З верша Я. Купалы «Моладзі». **17.** Маскарадны касцюм. **18.** Шаўковая бліскучая тканіна. **19.** Чэрвень — ... красавіка *(прык.)*. **20.** Кавалак хлеба, адрэзаны ад непачатага краю. **21.** Зуб, які ў некаторых жывёлін выступае з рота. **22.** Дзе вясёлая моладзь, там і ... *(прык.)*. **27.** Маладосць не грэх, а і ... не смех *(прык.)*. **28.** Калі ты не ..., за парус не бярыся *(кітайская прык.)*; 25 чэрвеня — Дзень марака *(марахода)*.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Прывабнасць, абаянне. **2.** Возера і ... — шчасце для рыбака *(прык.)*. **3.** Вельмі тонкі крык. **4.** Мужыку лета, што святому ... *(прык.)*. **5.** З усіх багаццяў на свеце самае вялікае багацце — ... *(прык.)*. **7.** Качка ды рыбка — божая ... *(прык.)*. **9.** Гібрыд ад міжродавых скрыжаванняў жывёл. **10.** Хроніка, гісторыя чаго-небудзь. **12.** «Бязмежная надзея і ... — галоўнае багацце моладзі». Р. Тагор. **13.** Чый ..., таго і рыба *(прык.)*. **14.** «А як выйдуць ляшчы, // Хоць ты ў ... пляшчы». З паэмы Я. Коласа «Міхасёвы прыгоды». **16.** «Будзе рыбачка, // Будзе юшачка. // А ты, мілы ..., — // Мая душачка». З прыпеўкі. **23.** Вялікі марскі рак. **24.** Цэнтр чаго-небудзь *(перан.)*. **25.** Беларуская багіня лета. **26.** Орган размнажэння ў грыбоў.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 4. Розум. 6. Палавіна. 8. Рыбалка. 11. Каза. 15. Надзея. 17. Даміно. 18. Атлас. 19. Унучак. 20. Акраец. 21. Ікол. 22. Радасць. 27. Старасць. 28. Марак.

Па вертыкалі: 1. Чары. 2. Рака. 3. Піск. 4. Рай. 5. Маладосць. 7. Даніна. 9. Бастард. 10. Летапіс. 12. Энтузіязм. 13. Бераг. 14. Ладкі. 16. Дружок. 23. Амар. 24. Ачаг. 25. Цёця. 26. Аск.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.34	19.37	13.03
Віцебск —	6.22	19.28	13.06
Магілёў —	6.24	19.28	13.04
Гомель —	6.22	19.23	13.01
Гродна —	6.50	19.52	13.02
Брэст —	6.52	19.51	12.59

Месяц

Апошняя квадра ў 12.25. Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Ганны, Анатоля, Арсенія, Апанаса, Васіля, Георгія, Дзяніса, Паўла, Рыгора, Савы, Фёдара.*
К. *Ірмы, Лукі, Мікалая.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

10 ВЕРАСНЯ

У краіне

1592 год — кароль Жыгімонт III, акрамя перадачы Мінску ўсіх навакольных зямельных надзелаў і ворных земляў, дазволіў пабудаваць на рацэ Пярэспа, «што выцякае з Камаровага балота», млын і папяровую фабрыку, млын на рацы Крупец, гарадскую васкабойню, зняў з горада абавязак плаціць усе падаткі, апроч надзвычайных, а таксама аказваць казённыя паслугі, за выключэннем абавязковага выдзялення калёсаў сваім і чужаземным паслам, якія накіроўваюцца з Кракава і Варшавы ў Маскву і назад.

1885 год — нарадзіўся Аляксандр Уладзіміравіч Паладзін, біяхімік, акадэмік НАН Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар больш за 240 навуковых прац па пытаннях біяхіміі вітамінаў, абмену рэчываў, параўнальнай біяхіміі нервовай тканкі і галаўнога мозга пры розных функцыянальных станах. Яго працы па біяхіміі мускульнай дзейнасці ляглі ў аснову сучасных уяўленняў функцыянальнай біяхіміі аб працэсах стамлення, адпачынку і трэніроўкі цягліц.

1950 год — нарадзіўся Анатоль Іванавіч Рацько, вучоны-хімік, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар хімічных навук. Аўтар больш за 220 навуковых прац, 53 вынаходак, аўтар навуковых прац у галіне калоіднай хіміі, па вывучэнні сарбентаў і сарбцыйных працэсаў.

У свеце

1925 год — нарадзіўся Барыс Аляксандравіч Чайкоўскі, расійскі кампазітар, народны артыст СССР. Пісаў кантаты, сімфоніі, канцэрты для інструментаў з аркестрам, камерна-інструментальных ансамбляў, у тым ліку струнных квартэтаў.

1955 год — нарадзілася Ларыса Аляксандраўна Доліна, расійская эстрадная, джазавая спявачка, актрыса, народная артыстка Расіі.

1960 год — 10—14 верасня на канферэнцыі ў Багдадзе заснавана Арганізацыя краін-экспарцёраў нафты (АПЕК). Арганізацыя створана для каардынацыі нафтавай палітыкі сваіх членаў і аказання дзяржавам тэхнічнай і эканамічнай дапамогі.

У гэты ж дзень на Белым моры з падводнай лодкі Б-67 праекта ПВ-611 выкананы першы ў СССР паспяховы прыцэльны пуск балістычнай ракеты Р-11ФМ з-пад вады. Галоўным яе недахопам была малая далёкасць — да 150 кіламетраў. У далейшым падводныя лодкі 629-га праекта былі мадэрнізаваныя пад ракеты Р-21 з далёкасцю 1400 км.

Так гаварыў...

ЛЕЎ ТАЛСТОЙ:

«Толькі б верылі людзі, што сіла не ў сіле, а ў праўдзе, і смела б выказвалі яе».

УСМІХНЕМСЯ

— Што ты ходзіш тут з перакрыўленым тварам?

— Жонка знайшла на маёй кашулі след ад губной памады...

— Гэта засада!

— Ды яшчэ якая... Трэці дзень ходзіць за мной: «Хачу такую ж!»

— Ты чаго крычыш?!

— Там павук!

— І што?

— Ён страшны!

— Можна падумаць, ты прыгажуня. Ён жа не крычыць...

Неяк увечары жонку пацягнула на ўспаміны...

— Любы, скажы, а ты памятаеш, калі ты вырашыў са мною ажаніцца?

— Вядома, памятаю! Калі даведаўся, што ты прадала падораны мною букет, я адразу зразумеў, ты менавіта тая жанчына, якая мне патрэбна!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 317 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2842.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 верасня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12